View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 378:811.161.3

***К. Г. Федарцова*** (elenavoevodkina@rambler),
*канд. філал. навук, дацэнт*

*Беларускі гандлёва-эканамічны
ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі
г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# ВЫКАРЫСТАННЕ МУЛЬТЫМЕДЫЙНАЙ ПРЭЗЕНТАЦЫІ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У артыкуле прыводзяцца вынікі практычнага прымянення мультымедыйных прэзентацый як выкладчыкам, так і студэнтамі на розных відах заняткаў і на любых этапах канкрэтнага занятка па беларускай мове.

The article is devoted to the results of practical application of multimedia presentations by both teachers and students at different kinds of classes and the specific stages of the Belarusian language classes.

У нашым грамадстве ёсць патрэба ў адукаваных, кваліфікаваных спецыялістах, якія вылучаюцца мабільнасцю, дынамізмам, ведаюць навуковыя дасягненні, паважаюць культуру і традыцыі як сваёй краіны, так і іншых краін. Таму важнейшая частка адукацыйнага працэсу патрабуе змен асноўных тэндэнцый, удасканалення адукацыйных тэхналогій.

Навучыць студэнтаў на працягу кароткага перыяду, абмежаванага вучэбнымі рамкамі ў 34 гадзіны, пытанням класічнага мовазнаўства і ўменню валодаць прафесійнай лексікай як у пісьмовай форме, так і ў вусным маўленні можна, калі спалучыць традыцыйныя і інавацыйныя метады навучання. Пры інавацыйным навучанні дасягаецца высокі ўзровень інтэлектуальнага, прафесійнага, асобаснага і маральнага развіцця студэнтаў.

Выкарыстанне электронных сродкаў навучання стварае новую якасць у навучанні мове: яно становіцца больш інтэлектуальным і творчым; мяняюцца традыцыйныя ролі выкладчыка і студэнта, гэтыя адносіны набываюць партнёрскі характар; павялічваецца доля ўсвядомленай самастойнай работы студэнтаў; у большай ступені праяўляецца індывідуалізацыя навучання [1]. Метадычна абгрунтаванае, правільнае выкарыстанне электронных сродкаў навучання дазваляе аблегчыць працэс засваення інфармацыі студэнтамі, робіць яго больш даходлівым, наглядным, актывізуе пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, тым самым павышаючы іх цікавасць да вывучэння беларускай мовы і беларускай тэрміналогіі.

Вучэбная камп'ютарная прэзентацыя з'яўляецца эфектыўным сродкам павышэння якасці навучання любой дысцыпліны за кошт свайго дыдактычнага патэнцыялу. Так, прэзентацыя забяспечвае выкладчыку наступныя магчымасці:

- інфармацыйную падтрымку;
- ілюстраванне;
- выкарыстанне разнастайных практыкаванняў;
- пашырэнне адукацыйнай прасторы заняткаў і інш.

Дзякуючы выкарыстанню прэзентацый у студэнтаў назіраюцца канцэнтрацыя ўвагі, уключэнне ўсіх відаў памяці (зрокавай, слыхавой, маторнай, асацыятыўнай), больш хуткае і глыбокае ўспрыняцце выкладзенага матэрыялу, павышэнне цікавасці да вывучэння прадмета, узрастанне матывацыі да вучобы.

Прэзентацыя можа быць выкарыстана на любым этапе заняткаў ці на любым відзе заняткаў. У нашай практыцы прэзентацыі найбольш часта выкарыстоўваюцца пры вывучэнні і замацаванні новага матэрыялу, у праектных формах работы студэнтаў, а таксама для знаёмства з краіназнаўчай інфармацыяй.

Так, да правядзення заняткаў па новых правілах беларускай арфаграфіі (2008 г.) падрыхтавана мультымедыйная прэзентацыя. Асноўным сродкам падачы тэарэтычнага матэрыялу выступаюць схемы і табліцы. Вартасцю такой прэзентацыі з'яўляецца дынамічнасць, паколькі на аснове схем і табліц для тлумачэння новай тэмы можна ствараць трэніровачны матэрыял, які дазваляе адпрацаваць і замацаваць змены ў беларускім правапісе. Падчас працы з табліцамі і схемамі няма неабходнасці выпісваць вялікую колькасць слоў на дошку, што значна эканоміць час. Акрамя таго, пры рабоце з мультымедыйнай прэзентацыяй выкладчык адразу заўважае рэакцыю студэнтаў на прадстаўлены новы матэрыял, а ў выпадку заўважаных цяжкасцей з лёгкасцю карэктуе сваё тлумачэнне, звяртаючыся да апорных ведаў, устанаўліваючы лагічныя сувязі і прыводзячы дадатковыя прыклады.

Таксама ў згаданую прэзентацыю ўвайшлі фотаздымкі з памылковым ці варыянтным напісаннем слоў, узятых з розных лексікаграфічных крыніц. Напрыклад, як жа правільна пісаць *камп'ютэр,*

*камп'ютар* ці *кампутар*; *бізнес* ці *бізнэс* альбо *тынэйджар, цінейджар, тынейджэр, цінэйджэр* ці *тынейджар*? Работа з фотаздымкамі заўсёды выклікае цікавасць, актывізуе мысленчую дзейнасць і спрыяе матывацыі да ведаў.

Даволі ўдалыя прэзентацыі былі прадэманстраваны падчас правядзення культурна-адукацыйнага мерапрыемства «Якубу Коласу – 130 гадоў! Са святам, беларусы!» (3 лістапада 2012 г.), у якіх прадэманстраваны фатаграфіі Я. Коласа, карціны мастакоў, скульптурныя кампазіцыі, цытаты з твораў пісьменніка і выказванні літаратурных крытыкаў.

На практычных занятках час ад часу выступаюць студэнты з дакладамі па тэмах, прапанаваных тыпавой праграмай па беларускай мове. Да некаторых з іх таксама былі падрыхтаваны прэзентацыі. Найбольш цікавымі і запамінальнымі паміж якіх з'яўляюцца наступныя:

- «Почырк і характар», падчас якой дэманстравалася звыш 10 рукапісных тэкстаў, напісаных рознымі людзьмі. Менавіта па почырку давалася асабістая характарыстыка аўтара рукапісу. Захапіўшыся выступленнем, студэнты пасля яго яшчэ доўга абмяркоўвалі свае почыркі і шукалі адпаведнасць іх свайму характару і характарам аднагрупнікаў.
- «З гісторыі беларускіх музычных інструментаў». Гэтая прэзентацыя дапамагала пазнаёміцца з музычнымі інструментамі (напрыклад, дуда, жалейка, свістулькі, цымбалы, гуслі і іншыя), убачыць, праслухаць гісторыю ўзнікнення і нават пачуць іх гучанне.
- «Музыка ў камені: Нясвіжскі замак». Пасля пачутага і ўбачанага ў прэзентацыі ў многіх студэнтаў узнікла жаданне наведаць гэтыя мясціны, а хто там ужо быў, то яшчэ раз згадаць тыя легенды, паданні і рэальныя падзеі стварэння і існавання Нясвіжскага замка.

Мультымедыйныя прэзентацыі выкарыстоўваюцца не толькі на практычных занятках, але і на факультатыве па беларускай мове. Найбольш цікавыя былі прысвечаны народным абрадам і звычаям, у прыватнасці масленіцы, калядам. Таксама на факультатыве гучалі даклады з прэзентацыямі са згаданай тыпавой праграмы па беларускай мове пад назвамі «Грыбы Беларусі (іх назвы і найменні ў беларускай і рускай мовах)», «Рыбы Беларусі (іх назвы і найменні ў беларускай і рускай мовах)» і інш. Кожнае найменне абмяркоўвалася: знаёмае ці не, спосабы яго ўтварэння, ці даводзілася частавацца разгляданымі ў выступленнях грыбамі і рыбай.

Апошнім часам ні адно выступленне па беларускай мове на студэнцкай навуковай канферэнцыі не абыходзіцца без мультымедыйнай прэзентацыі. Асабліва запамінальнымі былі прэзентацыі да дакладаў «Праявы эканоміі ў сучаснай беларускай мове» (Г. Цярэшка, 2013 г.) і «Помнікі літарам: прычыны ўзнікнення» (У. Міхнюк, 2014 г.). Нават калі прэзентацыі студэнтаў вызначаюцца пэўнай недапрацаванасцю, іх жаданне максімальна данесці неабходную інфармацыю, канцэнтруючы ўвагу слухачоў яшчэ і зрокава, выкладчыкам павінна толькі вітацца.

Пры падрыхтоўцы электроннага вучэбна-метадычнага комплекса па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для студэнтаў па дыстанцыйным навучанні, якое плануецца ўвесці на некаторыя спецыяльнасці ў Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэце спажывецкай кааперацыі ў 2014/2015 навучальным годзе, таксама шырока выкарыстоўваюцца камп'ютарныя прэзентацыі, што паспрыяе лепшаму азнаямленню і найбольш поўнаму засваенню пэўнага матэрыялу самастойна.

Заўважым, што мультымедыйныя прэзентацыі могуць быць самымі разнастайнымі, і многае тут залежыць ад узроўню камп'ютарных ведаў карыстальніка, яго творчых здольнасцей, фантазіі, умення выступаць перад аўдыторыяй і, безумоўна, жадання ствараць прэзентацыі.

Асобным палажэннем варта адзначыць наступныя станоўчыя аспекты прымянення мультымедыйнай прэзентацыі:

- сістэмны, яскравы і пераканаўчы выклад вучэбнага матэрыялу;
- вобразнае прадстаўленне складаных і абстрактных паняццяў;
- канцэнтрацыя візуальнай увагі студэнтаў на асабліва значных момантах вучэбнага матэрыялу;
- магчымасць прадстаўлення ў мультымедыйнай форме ўнікальных інфармацыйных матэрыялаў (карцін, рукапісаў, відэафрагментаў, гуказапісаў і інш.);
- забеспячэнне рэалізацыі метадычнай сістэмы выкладчыка [2].

Такім чынам, падача вучэбнага матэрыялу ў выглядзе мультымедыйнай прэзентацыі на занятках па беларускай мове дазваляе зрабіць працэс засваення лінгвістычнага матэрыялу больш эфектыўным, творчым, садзейнічае асэнсаванаму і трываламу запамінанню, а таксама развівае назіральнасць, уважлівасць, маўленне і мысленне студэнтаў.

## Спіс літаратуры

1. **Безкоровайная, Л. С.** Концепция современного учебного комплекса по русскому языку для студентов-иностранцев подготовительных факультетов / Л. С. Безкоровайная, В. Е. Штыленко, Е. Л. Штыленко // Методология обучения и повышения эффективности академической, социокультурной и психологической адаптации иностранных студентов в российском вузе: теоретические и прикладные аспекты : материалы Всерос. семинара, Томск, 21–23 окт. 2008 г. – Томск : Изд-во ТПУ, 2008. – Т. 1. – С. 18–25.
2. **Волынец, И. В.** Компьютерная презентация как средство обучения русскому языку как иностранному / И. В. Волынец, Т. В. Черняева, Г. Э. Чернецкая // Теория и практика преподавания лингвистических дисциплин в вузах негуманитарного профиля : материалы IV междунар. науч.-практ. конф., Горки, 18–19 окт. 2012 г. – Горки : Бел. гос. с.-х. акад., 2012. – С. 34–35.